**Лявончыкаў В.Е.,** *прафесар*

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА «ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ»

Праблемы культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў актыўна абмяркоўваюцца ў наш час як у Беларусі, так і ў замежных краінах. Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі нават пачаў з 1995 года выдаваць перыядычны навукова-метадычны зборнік «Культуралогія: праблемы выкладання». У 1996 годзе А.С.Зубра абараніў доктарскую дысертацыю «Педагагічныя асновы фарміравання культуры асобы студэнта вышэйшай школы». З'явілася значная колькасць навуковых і метадычных артыкулаў на старонках часопісаў. На жаль, навукоўцы пры вывучэнні гэтай праблемы недастаткова разглядаюць такі яе аспект, як інфармацыйная культура асобы.

У другой палове 80-х і асабліва ў 90-х гадах нашага стагоддзя ў краінах як далёкага, так і блізкага замежжа (асабліва ў Расіі і на Украіне) пачала актыўна даследавацца праблема культуралагічнага падыходу да такога феномена, як «інфармацыя». З'віліся не толькі артыкулы ў перыядычным друку, але і асобныя выданні, напрыклад зборнік «Інфарматыка і культура» (1990 г.), манаграфія Г.Г.Вараб'ёва «Твая інфармацыйная культура» (1988г.). У пачатку 90-х гадоў пры Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі (г.Масква) было арганізавана аддзяленне «Інфармацыйная культура асобы». Адным з накірункаў яго работы стала правядзенне штогадовых міжнародных навуковых канферэнцый па адпаведнай тэматыцы. Напрыклад, у 1993 г. адбылася канферэнцыя «Інфармацыйная культура спецыяліста: гуманітарныя праблемы», у 1994 г. — «Чалавек у свеце мастацтва: інфармацыйныя аспекты», у 1995 г. — «Інфармацыя і праблемы гуманітарнай адукацыі», у 1996 г.— «Інфармацыйная культура асобы: мінулае,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснае, будучае». У 1997 г. праведзена навуковая канферэнцыя па тэме «Інфармацыйнае грамадства: культуралагічныя аспекты і праблемы». Па кожнай з праведзеных канферэнцый выдадзены тэзісы дакладаў. Аб маштабах праведзеных навуковых форумаў сведчыць, напрыклад, такая лічба: у зборніку 1996 г. «Інфармацыйная культура асобы» надрукаваны каля 300 тэзісаў дакладаў вучоных (філосафаў, культуролагаў, псіхолагаў, педагогаў, мастацтвазнаўцаў, інфарматыкаў, філолагаў, бібліятэказнаўцаў) з Расіі, Украіны і некаторых іншых краін блізкага замежжа.

Акрамя навуковага напрамку, «Інфармацыйная культура асобы» стала выкладацца як вучэбная дысцыпліна ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтва Расіі, Украіны, Беларусі. Былі падрыхтаваны адпаведныя вучэбныя праграмы, а ў 1996 годзе ўпершыню ў Расіі выдадзены вучэбны дапаможнік Н.Б.Зіноўевай «Інфармацыйная культура асобы: уводзіны ў курс».

Статус «Інфармацыйнай культуры асобы» як вучэбнай дысцыпліны знаходзіцца на шляху станаўлення. Таму ў першую чаргу, на наш погляд, патрэбна дакладна адказаць на тры асноўныя пытанні:

1) што такое паняцце «інфармацыйная культура асобы»,

2) на метадалогіі і матэрыялах якіх дысцыплін непасрэдна грунтуецца праблематыка курса,

3) якія тэматычныя модулі складаюць змест курса.

Пачнём з разгляду асноўнага для нас паняцця «інфармацыйная культура асобы». Аналіз існуючых у навуковай і вучэбнай літаратуры яго азначэнняў сведчыць, што яны створаны на аснове рэальных паняццяў, пабудаваных на прымеце «род — від», або намінальных.

Так, інфармацыйная культура, па азначэнню аднаго з вядучых спецыялістаў Расіі ў галіне інфарматызацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Э.П.Семенюка,— гэта «інфармацыйная кампанента чалавечай культуры ўвогуле, якая характарызуе ўзровень усіх ажыццяўляемых інфармацыйных адносін». Блізка да такога разумення гэтага паняцця стаіць А.А.Вітухноўская, якая лічыць, што яно характарызуе адну «з граней культуры, звязана з інфармацыйным аспектам жыцця людзей». Н.Б.Зіноўева адносіць гэта паняцце да аднаго з відаў культуры, побач з такімі яе інтэграванымі відамі, як палітычная культура, экалагічная культура і г.д. А І.Г.Хангельдыева вызначае яго праз такую шырокую культуралагічную катэгорыю, як «асобы тып культуры». Ёсць яшчэ некалькі намінальных азначэнняў паняцця «інфармацыйная культура». Яны належаць М.Я.Дворкінай, Ю.Ю.Мілітараву і І.М.Яглому. Нягледзячы на невялікія адрозненні, усе гэтыя аўтары лічаць, што інфармацыйная культура ёсць сукупнасць ведаў, нормаў, правілаў, каштоўнасцей, створаных у інфармацыйнай дзейнасці, якія адлюстроўваюць пэўны ўзровень яе развіцця.

Існуючыя дэфініцыі інфармацыйнай культуры не дазваляюць дакладна адказаць на пытанне, што гэта такое: тып культуры, від культуры, грань культуры ці інш. Справа ў тым, што ў існуючых у тэорыі культуры тыпалагічных і відавых класіфікацыях няма «інфармацыйнай культуры», і гэта невыпадкова. Апошняя з'яўляецца свайго роду «скразным аспектам», характэрным для ўсіх этнаматэрыяльных, сацыяльных і глабальных тыпаў культуры, а таксама такіх інтэграваных яе відаў, як экалагічнай, эканамічнай, палітычнай, прававой, маральнай, рэлігійнай культуры і інш. Такім чынам, спецыфіка вывучаемага намі феномена дазваляе зрабіць выснову, што найбольш верагодным можа быць азначэнне інфармацыйнай культуры з улікам аспекту культуры, які характарызуе інфармацыйны ўзровень грамадства, пэўнай яго групы ці асобы.

Цяпер засяродзім сваю ўвагу на другім пытанні: на якой метадалогіі і матэрыялах базіруецца інфармацыйная культура?



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Наяўнасць у гэтым словаспалучэнні ключавога слова «культура» натуральна патрабуе, каб у якасці метадалагічнай асновы для вывучэння праблем інфармацыйнай культуры выкарыстаць культуралогію (асабліва такі яе раздзел, як «Тэорыя культуры»). Нават вызначэнне сутнасці разглядаемага намі паняцця, як мы ўжо пераканаліся, патрабуе выкарыстання некультуралагічных катэгорый.

Вельмі плённым з'явіўся культуралагічны падыход да зыходнага, дастаткова шырокага ўяўлення аб паняцці «інфармацыя». Ён дазволіў кваліфікаваць інфармацыю як сацыякультурны прадукт, форму функцыяніравання каштоўнасцей культуры. У залежнасці ад суб'екта, які выступае носьбітам інфармацыйнай культуры, апошняя можа існаваць у трох іпастасях: інфармацыйная культура грамадства, асобных груп і асобы. Таму інфармацыйная культура асобы павінна выкарыстоўваць асобасны падыход, распрацаваны ў культуралогіі. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што культура разглядаецца ў індывідуальным вымярэнні і характарызуе стан унутранага, духоўнага свету чалавека. Эўрыстычнымі для вывучэння сутнасці інфармацыйнай культуры асобы з'явіліся і іншыя вектары тэарэтыка-метадалагічнага аналізу культуры, менавіта: аксіялагічны, семіятычны, дзейсны, трансляцыйны, дынамічны і інш. Яны дазволілі ўзбагаціць паняційны апарат гэтай дысцыпліны такімі тэрмінамі, як «культурнае ўспрыманне інфармацыі», «культурнае інфармаванне» і шмат інш., а таксама спрыялі вывучэнню інфармацыі як культурнай каштоўнасці і формы перадачы (трансляцыі) яе ад пакалення да пакалення, своеасаблівай знакава-сімвалічнай сістэмы, вербальнага і невербальнага сродку камунікацыі.

Другой дысцыплінай, якая мае важнае метадалагічнае значэнне для інфармацыйнай культуры асобы, з'яўляецца тэорыя інфармацыі. Ёсць нават прыхільнікі такога пункту гледжан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня, згодна з якім паняцце «інфармацыя» мае больш глабальнае значэнне нават адносна паняцця «культура». Вучоны Ю.М.Лотман, напрыклад, лічыць, што культура — гэта «інфармацыйная звышмашына», інтэгруючая працу індывідуальных прыёмнікаў семантычнай інфармацыі.

У якасці дадатковых навуковых дысцыплін, на метадалогіі і паняцці якіх абапіраецца інфармацыйная культура асобы, выступаюць псіхалогія, сацыялогія, педагогіка, кнігазнаўства, бібліяграфазнаўства і архівазнаўства. Напрыклад, палажэнне псіхолага Л.П.Лявонцьева аб тым, што неабходна адрозніваць у каштоўнасна-арыентацыйнай дзейнасці чалавека «аб'ектыўнае значэнне» і «асобасны сэнс», дазволіла ўдакладніць крытэрыі адбору інфармацыі, не толькі зыходзячы з яе сацыяльнай (аб'ектыўнай) значнасці, але і ўлічваючы асобасны сэнс. Тэарэтыкі інфармацыі, у адпаведнасці з наяўнасцю дадзенай якасці ў інфармацыі, вылучалі такую ж уласцівасць, як карыснасць, гэта значыць ступень адпаведнасці інфармацыі мэтам індывіда, якія ён ставіць і здзяйсняе ў пэўныя прамежкі часу.

Нарэшце, зробім спробу вызначыць змест курса «Інфармацыйная культура асобы». На наш погляд, ён складаецца з трох вялікіх тэматычных модуляў (блокаў). Першы з іх мае светапоглядны характар і ставіць сваёй канчатковай задачай сфарміраваць інфарацыйны светапогляд студэнта. Тут вывучаюцца такія пытанні, як сацыяльна-гістарычныя этапы і парадыгмы інфармацыйнай культуры грамадства; асноўныя паняцці, законы і заканамернасці вытворчасці і распаўсюджвання інфармацыі, яе роля ў працэсе фарміравання мыслення, паводзін, дзейнасці асобы; структура інфармацыйных патрэб і спосабаў іх задавальнення; псіхафізіялагічныя асаблівасці ўспрымання інфармацыі асобай.

Паняцце «інфармацыйны светапогляд» параўнальна новае. Вучоныя адносяць яго да спецыфічнага тыпу светапогляду, які адрозніваецца ад мадэліраванага тым, што выпрацоўваецца

«не столькі як пэўная мадэль установак асобы, колькі як працэс аналізу ведаў для абгрунтавання прыватнай пазіцыі, працэс авалодання навыкамі разумення чужога светаўспрымання, суадносін яго з асабістым». Для яго характэрны адкрытасць, магчымасць удакладнення, паглыблення, змянення, наяўнасць супрацьлеглых поглядаў. Асноўны культуралагічны прынцып дыялогу культур з'яўляецца вядучым для ўсведамлення. Менавіта ён дазволіў навукова абгрунтаваць механізм уключэння ў культуру (ці, наадварот, адарвання ад яе) інфармацыі (ведаў, вопыту), якая ўзнікла ў іншых этнатэрытарыяльных ці сацыяльных тыпах культур.

Другі блок зместу курса «Інфармацыйная культура асобы» ўключае задачы фарміравання інфармацыйнага стылю мыслення і культуры вытворчасці і выкарыстання інфармацыі. У межах яго разглядаюцца пытанні выпрацоўкі інфармацыйнага мыслення, выхавання маральна-этычных, прававых, псіхалагічных якасцей асобы ў працэсе стварэння, распаўсюджвання і ўспрымання інфармацыі. Тут трэба прывіць студэнтам неабходныя этычныя прынцыпы, аптымальныя формы паводзін, рацыянальныя звычкі, сістэму процістаяння, неабходную для абароны асобы ад магчымых інфармацыйных маніпуляцый і агрэсіі масавай культуры, а таксама выхаваць пачуццё адказнасці за вытворчасць і распаўсюджванне інфармацыі, якая можа мець негатыўнае ўздзеянне на асобу і грамадства. У псіхалагічным аспекце неабходна выпрацаваць у студэнтаў аптымальную рэакцыю асобы ва ўмовах дэфіцыту ці лішку інфармацыі, а ў сацыялагічным — садзейнічаць набыццю асобай неабходнага ўзроўню інфармаванасці, які з'яўляецца абавязковай умовай яе сацыялізацыі, выкарыстання ёю розных функцый у грамадстве.

У трэці блок задач курса «Інфармацыйная культура асобы» ўваходзяць методыка-тэхналагічныя пытанні, звязаныя з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў грамадства. Гэта зна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыць, што студэнты пры вывучэнні адпаведнага раздзела павінны ведаць структуру інфармацыйных рэсурсаў грамадства; засвоіць алгарытм пошуку дакументнай інфармацыі ў традыцыйных і электронных інфармацыйна-пошукавых сістэмах; умець самастойна працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі; вызначаць змест дакумента пры беглым яго праглядзе, адбіраць неабходную інфармацыю; арганізоўваць і весці асабістыя картатэкі і базы даных.

**Грыцкевіч Н.П.**, *дацэнт*

## ВЫКАРЫСТАННЕ КАМП'ЮТЭРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

Сучасны перыяд развіцця нашага грамадства можна назваць перыядам інфармацыйных тэхналогій. Наша грамадства пераўтвараецца ў так званае інфармацыйнае грамадства. Вялікую ролю ў працэсе гэтага пераўтварэння адыгрывае адукацыя.

Інфармацыйныя тэхналогіі не з'яўляюцца чарадзейнай палачкай. Яны садзейнічаюць абнаўленню адукацыі, але выконваюць ролю дапаможнага сродку навучання. Выкарыстоўваючы новыя тэхналогіі, не трэба іх ідэалізаваць і адначасова нельга недаацэньваць.

Мы павінны выкарыстоўваць іх, па-першае, таму, што, яны маюць вельмі рэальныя адукацыйныя магчымасці. Па-другое, таму што нам неабходна рыхтаваць маладых людзей да жыцця, у якім роля новых тэхналогій будзе ўзрастаць.

Характэрнай асаблівасцю сучаснага стану вышэйшай адукацыі з'яўляецца рост патрэбнасці ў індывідуалізаваным вывучэнні замежных моў.Вялікую ролю ў гэтым можа адыграць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ